# ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ
# “МАЛАЯ РАДЗІМА ПАД ГЕРБАМ “БАГОРЫЯ”

**Складальнікі:** навуковае таварыства "Новае пакаленне" ДУА “Мацькаўскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа”.

**Кіраўнік:** Рогач Валерый Мікалаевіч, настаўнік гісторыі ДУА “Мацькаўскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад- базавая школа”.

**Мэта экскурсіі:** фарміраванне ў вучняў грамадзянска-патрыятычных і духоўна-маральных якасцяў праз далучэнне да гісторыка-культурных і духоўных каштоўнасцей роднага краю.

**Задачы экскурсіі:** шырокае далучэнне навучаемых да культурна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці, накіраваную на пошук і атрыманне новых ведаў аб гісторыка-культурных і культавых каштоўнасцях Малой радзімы і аб’яднанне арганізацыйных і адукацыйных магчымасцей установы адукацыі і дзяржаўнай установы “Вілейскі краязнаўчы музей” для дасягнення пастаўленнай мэты.

**Тып экскурсіі:** гістарычная.

**Від экскурсіі:** аўтобусна-пешая (пешаходная).

**Працяг экскурсіі:** 4 гадзіны

**Даўжыня маршрута:** 45 км.

**Маршрут экскурсіі:** в. Мацькаўцы – в. Стайкі – в. Альковічы – в. Старынкі – в. Мацькаўцы.

**Змест экскурсіі:** па ходу экскурсіі яе ўдзельнікі знаёмяцца з сядзіба-паркавымі забудовамі роду Багдановічаў герба “Багорыя” і гісторыяй касцёла ў в. Альковічы.

Мікрараён ДУА “Мацькаўскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа” размешчаны на паўночна-усходняй акраіне Вілейскага раёна і мяжуецца з Лагойскім раёнам. Двор “Стайкі” належаў роду Багдановічаў з 1-ай пал. 18 ст.. Першы ўладальнік – Тадэвуш, будаваў сядзібу ў стылі барока. У канцы стагоддзя Стайкі (двор) быў перабудаваны ў стылі класіцызму. Да канца 19 стагоддзя выдзяляюцца 3 асобыя маёнткі: Двор Стайкі, Мацькаўцы і Старынкі рода Багдановічаў герба “Багорыя”. Кожны маёнтак меў і сядзібны дом і парк, гаспадарчыя і культурныя пабудовы, водную сістэму у выглядзе млыноў, сажалак, каналаў якія злучалі сажалкі, або адводзілі лішак вады.

Помнік загінуўшым воінам-землякам размешчаны на скрыжаванні дарог у в. Мацькаўцы, каля вялізнай сажалкі былога маёнтка. А касцёл, размешчаны ў в. Альковічы, вядомы з 17 ст., акутаны прыгожымі легендамі і не менш цікавай сучаснай гісторыяй.

Агульныя метадычныя парады да тэмы экскурсіі:

- экскурсавод павінен валодаць вялікім аб'ёмам інфармацыі аб роду Багдановічаў герба "Багорыя" і аўтарах кніг аб сядзібах гэтага роду, апошніх нашчадках роду;
- экскурсія павінна праводзіцца ў адпаведнасці дыферынцыраванага падыходу да экскурсантаў;
- для павышэння эфектыўнасці экскурсіі неабходна шырэй выкарыстоўваць наглядны матэрыял: (збудаванні, сажалкі, помнікі, рэшткі паркаў і г. д.)

Агульныя арганізацыйныя рэкамендацыі:

у час правядзення экскурсіі строга выконваць правілы бяспекі ўдзельнікамі экскурсіі, правіл дарожнага руху, інструктаваць экскурсантаў аб выкананні норм бяспекі пры аглядзе аб'ектаў: збудаванняў і водных сістэм.

**Уступ да экскурсіі:**

- арганізацыйны ўступ зрабіць пры сустрэчы з групай да пачатку руху, прыгадаць групе сваё імя і імя па бацьку, абгаварыць неабходныя арганізацыйныя пытанні і засяродзіць увагу на правілах паводзін пад час экскурсіі і нормам бяспекі;
- у інфармацыйнай частцы ўступу коратка паведаміць аб тэме і асноўных аб'ектах экскурсіі;
- стварыць адпаведную атмасферу на ўспрыняцце будучай экскурсіі і ўстанавіць з экскурсантамі эмацыянальна-псіхалагічны кантакт.

Працяг уступу 5-7 хвілін.

**Падвядзенне вынікаў:** Абагульненне зрабіць каля будынка ДУА "Мацькаўскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа" в.Мацькаўцы.

**Працяг падвядзення вынікаў** – 10 хвілін.

# ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ “МАЛАЯ РАДЗІМА ПАД ГЕРБАМ “БАГОРЫЯ”

| Маршрут | Месца астаноўкі | Аб’ект паказа | Працягласць паказа | Назва падтэмы і асноўныя пытанні | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя парады |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уступ (10 хвілін) | | | | | | |
| в.Мацькаўцы<br>1) Помнік загінаўшым воінам і землякам у гады ВАВ.<br><br>2) Сажалкі былога маёнтка Мацькаўцы. | Пляцоўка перад помнікам (за 100 м)<br><br>Пешы пераход да захаваўшыхся пабудоў сядзібы Мацькаўцы | 1)Помнік загінуўшым воінам і землякам у гады ВАВ.<br><br>2)Водная сістэма (сажалкі) сядзібы (маёнтка) Мацькаўцы рода Багдановічаў герба “Багорыя” Гаспадарчыя будынкі.<br><br>Сядзібы Мацькаўцы рода Багдановічаў герба “Багорыя” | 20 хвілін<br><br>30 хвілін | Звесткі аб устаноўцы помніка Гераізм мясцвага насельніцтва ў гады ВАВ.<br><br>Інфармацыя аб узнікненні маёнтка Мацькаўцы і яго ўласніках.<br><br>Плантроўка маёнтка. Эклектыка.<br>Наяўнасць вялікага сядзібнага дома, парка, гаспадарчага двара і воднай сістэмы | Група размяшчаецца такім чынам, каб не ствараць памехі рухаючамуся транспарту. Тэхніка бяспекі. Помнік і сажалкі перад экскурсантамі<br><br>Група размяшчаецца паўкругам ад паказу гаспадарчых пабудоў. | Выкарыстоўваць прыёмы паказа (папярэдні агляд і аповед) экскурсійная справа.<br><br>Выкарыстанне ксеракопій фотаздымкаў былога сядзібнага дома і гаспадарчых пабудоў. |
| Пераезд у вёску Стайкі (9 хвілін) 5 км | | | | | | |
| Вёска Стайкі Двор “Стайкі” | Пляцоўка перад адноўленымі будынкамі | Рэстаўрацыйныя работы і адноўленыя будынкі Двара | 40 хвілін | Абзорная экскурсія двор “Стайкі” – помнік барока і класіцызма. | Экскурсію праводзіць экскурсавод з упраўляючым (па дамоўленасці) | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналіза, лакалізацыі падзей і гістарычных асоб. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Двара “Стайкі” | “Стайкі” рода Багдановічаў герба “Багорыя” | | Гісторыя радавога гнязда Багдановічаў герба Багорыя. Першыя гаспадары Двара “Стайкі” і яго росквіт.<br><br>Ад заняпаду і разбурэння да рэстаўрацыйных работ і аднаўлення. Новае жыццё Двара “Стайкі”. | адноўленага комплекса.<br><br>Група размяшчаецца ў залежнасці ад размяшчэння аб’екта паказу. | |
| Пераезд у в.Альковічы (8 хвілін) 4,6 км | | | | | | |
| в.Альковічы | Пляцоўка непадалёку ад касцёла. | Касцёл “Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі ” | 45 хвілін | Сустрэча і кароткае знаёмства з групаё.<br><br>Знаёмства з легендамі аб гісторыі будаўніцтва касцёла і яго архітэктурай.<br><br>Знаёмства з унутранім уборы храма. Аповед ксяндза. | Знаёмства з правіламі паводзін пад час экскурсіі, парадку руху, размяшчэнна на месцах астановак, мер бяспекі і парадак агучвання пытанняў да экскурсавода (на прыканцы экскурсіі). | Прапанаваць групе размясціцца паўкругам, але не больш чым у два рады. |
| Пераезд у в. Старынкі (18 хвілін) 15 км | | | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| в. Старынкі | Сядзібны дом рода Багдановічаў герба “Багорыя” | Сядзібны дом рода Багдановічаў, рэшткі алей сядзібнага парка | 35 хвілін | Легенда і факт набыцця маёнтка Старынкі (выйгрыш у карты) Багдановічам у рода Тукайлаў. Аднаўленне маёнтка і стварэнне моцнай гаспадарчай інфраструктуры: пладовы сад, водная сістэма,вялізны гаспадарчы двор.Магчымасць рэстаўрацыі сядзібнага дома маёнтка Старынкі. | Папярэдні агляд сядзібнага дома, пад’язной брукаванай дарогі і рэштках парка. Група размяшчаецца перад парадным уваходам у сядзібны дом.<br><br>Тэхніка бяспекі (немагчымасць наведвання пакояўдома). | Група размяшчаецца паўкругам каля сядзібнага дома і адвольна пры знаёмстве з пад’язной дарогай і рэшткамі парка. |
| Пераезд у в. Мацькаўцы (16 хвілін) 12 км | | | | | | |
| в. Мацькаўцы | ДУА “Мацькаўскі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа” | | 10 хвілін | Кароткі агляд тых аб’ектаў з якімі пазнаёміліся ў час экскурсіі “Малая радзіма пад гербам Багорыя”.” | Экскурсавод ўзгадвае аб уважлівых адносінах да сваіх рэчаў і развітваецца з экскурсантамі. | Прапанаваць членам групы аставіць запіс аб уражанні ад экскурсіі ў журнале экскурсавода. |



Фота 1. Вёска Мацькаўцы. Паравы млын былога маёнтка Мацькаўцы пач. XX ст.



Фота 2. Вёска Стайкі. Стаецкі бровар ў Сядзібе Багдановічаў (пасля рэстаўрацыі)



Фота 3. Вёска Альковічы. Касцёл Адведзінаў Панны Марыі



Фота 4. Касцёл, унутраняе убранне



Фота 5. Вёска Старынкі. Сядзібны дом маёнтка ў сядзібна-паркавым ансамблі Багдановічаў 18 ст.



Фота 6. Рэшткі парка і брукаванай дарогі